Б2 1/36

Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ

№ 16
1933 г.

Фота С. Грына

На Ўсебеларускім зьезьдзе лепшых ударнікаў сацыялістычных палёў

Лельчыцкія дэлегаткі

Лорман Ента.
Ударніца-сьвінарка калгасу „12-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі", Лельчыцкі раён. Дэлегат Ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

З мядзьвежых куткоў Лельчыцкага раёну, раскінутага сярод непраходных лясоў і балот, за 70 кілёмэтраў ад чыгункі прыехалі на зьезд у чырвоную сталіцу лепшыя з лепшых ударніцы сацыялістычных палёў.

Быў вечар, павяваў веснавы вецярок, калі калгасьнікі калгасу „12-цігодзьдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі" сабраліся выбраць свайго дэлегата на Ўсебеларускі зьезд. Шмат ёсьць у колгасе ўдарнікаў, якія маюць права быць пасланымі на зьезд. Але сход аднагалосна ўхваліў паслаць лепшую сьвінарку калгасу Енту Лорман.

Ента гэтага заслужыла. Атрымаўшы пад свой догляд 100 штук амаль хворых сьвіней яна іх гадуе так, што яны зараз выглядаюць, як галушкі. Ды яшчэ выгадавала 50 штук прыплоду. Адыходу зараз зусім няма. „Устаю ў 3 гадзіны ночы і ўжо ў 6 гадзін маесьвіньні накормлены і напоены. У 12 гадзін я іх зноў кармлю, у дзьве гадзіны выпускаю на прагулку, пасьля даю ім вячэру ў 6 гадзін. Гляджу іх нібы дзяцей, таму яны і выглядаюць так. І сабе паглядзець і людзям паказаць". Так расказвае аб сваёй працы сама Ента.

Былая батрачка Лорман, перанёсшая голад, холад і жабрацтва царскага рэжыму, зараз ведае цану новага жыцьця. Выхаванка дэлегацкага сходу, яна лепшы арганізатар перамог у загатоўках па Бараўскім сельсавеце, ударніца па падрыхтоўцы калгасу да веснавой сяўбы. Вось чаму калгас паслаў яе на зьезд.

На запытаньне, што даў ёй калгас, Лорман, крыху апусьціўшы галаву, кідае позірк на толькі што атрыманую прэмію—джэмпэр з шаўковымі бліскучымі кропкамі, і кажа:

„Ну чаго мне зараз не хапае? І хлеб ёсьць, і да хлеба. Я, скажам, выпрацавала 413,01 працадзён. Атрымала 100 пудоў збожжа, бульбы 140 пудоў, маю карову, сьвіней з парасятамі, і са сваіх прадуктаў, атрыманых на працадні, я яшчэ дала дзяржаве 5 пудоў збожжа, 13 пудоў бульбы, 20 кгр. пянькі і інш. Я маю гонар, што мяне, былую батрачку, нямеўшую кавалка хлеба, зараз выбіраюць усюды. Я член партыі, член праўленьня калгасу, член праўленьня сельспажыўтаварыства, кіраўнік дэлегацкага сходу, прымаю ўдзел ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях. Калгас мяне зрабіў чалавекам.

— Магу пахваліцца, што наш калгас да вясны зусім падрыхтован. Быў пробны выезд, які паказаў, што мы хоць сёньня гатовы сеяць, абы толькі зямля падсохла. Гной вывезен, насеньне ня толькі ссыпана, але і ачышчана, інвэнтар увесь прыгатован. Пад ясьлі і пляцоўку ўжо прыгатавана і памяшканьне, і ложкі, і харчаванье—толькі дзяцей нясі. Было ў нас шмат недахопаў, бо арудавалі ў калгасе кулакі, рабіны. Уявеце сабе, рабін на пасадзе рахункавода, праўда ён прыкідваўся такім слаўным, „сваім хлопцам", як быццам і нічога, а на самой справе ён шкодзіў нам шмат. Зараз мы яго ўжо выкінулі і яшчэ пару кулакоў, так што і жыць нам пасьля гэтага лягчэй стала. Зараз мяне зноў вылучаюць брыгадзірам палявой брыгады,

* * *

Вышываная мужчынская рубашка, хустка з чырвонымі канцавінамі, сур'ёзны твар — гэта дэлегатка калгасу „Чырвоны араты" ПаўлечкаПараска. Яна—лепшая даярка калгасу першы раз у жыцьці едзе па чыгунцы, першы раз у цягніку. Да зімы працавала ў палявой брыгадзе і адзначалася самаадданейшай працай. Яшчэ ня было, каб Параска ў дзень выпрацавала адзін працадзень, заўсёды $2^1/_1$—2 самае меншае.

— Я і Варуновіч Хвядора заварочваем у калгасе. Хоць на нас і злуюць гультаі, але-ж мы іх адсякаем заўсёды.

— Вось, напрыклад, Надзя Кудзін, Ліхавец Хвядора гультаяватыя бабы, трэба праўду сказаць, заўсёды вышчараюцца: „Хай ўдарніцы робяць, іх-жа прэміююць". Але ўсе нашы калгасьніцы ня ідуць за гэтым кулацкім ахвосьцем, а працуюць добра разам з намі.

— У калгасе я навучылася пісаць, чытаць. Можна сказаць, як павязку з маіх вачэй калгас скінуў. На дэлегацкім сходзе я павышаю свой палітычны ўзровень, актыўна наведваю аграгурток і атрымліваю веды, неабходныя для маёй працы ў гаспадарцы. Гэта ўсё я вельмі цаню і ведаю, што для былой няпісьменнай забітай бяднячкі, такую дарогу можа паказаць толькі савецкая ўлада.

Сям'і ў мяне 4 душы, а працуем мы ўдваіх з мужам. І выпрацавалі 120 пудоў збожжа, каля 150 пудоў бульбы. Хіба-ж мы гэта паядзім за адзін год?

Павлечка
Ударніца к-су „Чырвоны Араты", Лельчыцкі раён. Дэлегат Усебеларускага зьезду калгасьнікаў- ударнікаў

Маю карову, курэй, сьвіньню, двое парасят, нават дзіўлюся, як гэта мы столькі выпрацавалі ўдваіх Я хачу сказаць, што мы ўжо зараз жывем добра, а калі выканаем наказ тав. Сталіна ў бліжэйшы час зрабіць усіх нас заможнымі, то я сабе не ўяўляю, які рай будзе на зямлі.

Вось чым зрабілася ў калгасе я—бяднячка, раней рэдка меўшая кавалак хлеба. Кулацкія прыхлябальнікі ўвесь час з нас сьмяяліся: „галадранцы, нешта пабудуюць... Галаву скора зьвернеце, рабочыя дык жывуць што трэба, а з вас яны будуць тры скуры драць"—шыпелі яны.— Хлусьня гэта ўсё, кулацкая хлусьня, я аб гэтым заяўляю на ўвесь сьвет. Рабочыя нам самыя лепшыя сябры, як яны нас сустрэлі! Музыка. Нават торбачку маю з хлебам і то якісьці рабочы памог паднесьці з вагона, а потым на аўтамабіль і павезьлі. Ці чулі мы раней аб гэтым, каб нас сустрэлі, няньчыліся так з намі, як нямаведама з кім. Ну і мы перад рабочымі ў даўгу не застанемся,

Мяне чатыры разы прэміявалі за работу, гэта-ж не за прыгожыя вочы, а за справу, значыць працуем добра.

Абавязкі перад дзяржавай выканалі поўнасьцю і ў тэрмін. Да вясны гатовы. Аб гэтым красамоўна заявіў пробны выезд у поле. Пры выезьдзе ўсё было гатова, не гаворачы ўжо аб конях, інвэнтары, аптэчка прыгатавана, нават агітатары брыгадныя сядзелі кожны на сваіх мясцох.

Мы спадзяемся сяўбу скончыць за 15 дзён і нават раней. Будзем працаваць так, як гэта патрабуецца зараз, каб было і сабе, і рабочым і Чырвонай арміі.

* * *

Брыгадзір палявой брыгады калгасу „Перамога" Мар'я Крукоўская трымае сябе вельмі важна на зьезьдзе. Выгляд сапраўднай гаспадыні, твар крыху ў маршчынах. Ні аднаго слова прамоўцы яна не прапускае, ведаючы, што ёй прыдзецца застасоўваць усё на практыцы.

— Я то гаварыць многа ня ўмею, а вось на працы справа іншая. Як тут гавораць пра кулакоў, то ў мяне аж дрыжыкі па целу праходзяць, дужа ўжо я нагаравалася ў іхнюю бытнасьць. А як калгас арганізавалі — нясмачна гэта кулаком было, яны і давай розныя чуткі распускаць: „Вось прыдуць палякі, прыхварэе, прастагнее яна, скуру драць будуць." А я ведаю, што вось гэта мой адзіны шлях, гэта мой сьвет адкрыўся і пайшла я па гэтым шляху калгасным.

Не хвалюся—працавала я добра. Гультайкі—Зося Карповіч, Лекса Машчынская пачалі цкаваць мяне: „Ёй даюць прэміроўку, хай яна і працуе!"—крычалі яны.

Калі прыехалі трактары на наша поле кулакі гаварылі: „Папатрахкаюць вашы зубы так, як трахкаюць гэтыя трактары" — і думалі запужаць нас гэтымі праклёнамі.

Не абыйшлося бяз шкоднікаў і ў самім калгасе. У мінулым годзе кулак Хвацік пагнаіў бульбу, а сёлета ўжо наша бульба вельмі добра захавана. Яны нас хацелі-б вярнуць да старога жыцьця. Але я гатова памерці ў барацьбе за калгас, за яго ўмацаваньне. Добра памятаю ранейшае. Як хадзіла я да кулака на працу. Дзеці малыя плачуць, цягнуць за сукенку, мазалі крывавыя, а што мне за гэта дадуць?—талерачку мукі, ды лапці.

А сёньня чаравікі, чобаты, ды не абыякія, а бліскучыя, харчамі забясьпечана на цэлы год.

Прэміявалі мяне некалькі разоў. Працую членам праўленьня калгасу ўжо 3 г. і членам праўленьня сельспажыўтаварыства. Па маёй ініцыятыве пасьля раённага зьезду арганізавалі пробны выезд у поле. Гною вывезена 500 вазоў, насеньне, інвэнтар, коні, збруя ў баявой гатоўнасьці. Я вельмі задаволена тым, што зараз наша жыцьцё ўвесь час няўхільна паляпшаецца, што мы сьмела глядзім уперад і жывем будучыняй.

Посьпехі гэтыя яшчэ невялікія. Прыехаўшы са зьезду, я арганізую сваю брыгаду на лепшае і сваячасовае правядзеньне веснакой сяўбы, 100-процантны выхад усіх калгасьніц на працу.

* * *

Сонечні прамень прабег па тварах дэлегатак і прымусіў іх схамянуцца. Цяплыня на вуліцы паказвае на блізасьць сяўбы. Таму дэлегаткі з нецярплівасьцю глядзяць на сонца, якое ўсё павышаецца і павышаецца. Прыехаўшы са зьезду, яны будуць сапраўднымі змагарамі за бальшавіцкія калгасы ў Лельчыцкім раёне.

Ганна.

Жанарганізатар Лельчыцкага райкому партыі т. Седзінкіна

Выпрацавала 340 працадзён

Хайкіна ўдарніца калгасу „Колас", Магілеўскага раёну, дэлегат Усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, расказвае аб сваёй працы:

— Цяжка было змагацца за калгас. Але цяжкасьці засталіся ззаду. Зараз-мы па-баявому змагаемся за ўмацаваньне нашага калгасу. Да вясны гатовы. Насеньне і інвэнтар у вельмі добрым выглядзе і захоўваецца добра. На працадзень у гэтым годзе мы атрымалі 1,26 кгр. жыта, 7 кгр. бульбы і іншыя культуры. Я дэлегатка, некалькі раз прэміявана, выпрацавала 340 працадзён.

У далейшым, атрымаўшы на зьезьдзе зарадку, яшчэ больш буду змагацца за тое, каб зрабіць наш калгас сапраўды бальшавіцкім

Крукоўская Мар'я
Ударніца к-су „Перамога" Лельчыцкі раён. Дэлегат Усебеларускага зьезду калгасьнікай-ударнікаў

Р. 3

„Мы ніколі ня мелі столькі хлеба, колькі атрымалі сёлета ў калгасе“

Маланьня Лукашова

Маланьня Лукашова прыехала ў Менск. Яе прыслаў лепшы калгас імя Сталіна, Горскага сельсавету, Горацкага раёну, на Усебеларускі зьезд калгасьнікаўударнікаў расказаць аб дасягненьнях свайго калгасу, аб тэй вялікай радасьці, якою поўны сёнешні калгасьнік, радасьцю калектыўнай працы.

— А раней, першы год, няма чаго таіць,—аднэй нагой у калгасе, а другой ладзіш як-бы гэта што зрабіць на сядзібцы сваёй...

Маланьні Лукашовай 35 год. На яе і мужніных плячох сям'я ў 10 чалавек. У сям'і трое працаздольных. Да ўступленьня ў калгас, яны—маламоцыя сераднякі. Свайго хлеба рэдка калі хапала.

— А цяпер, ня мелі ніколі столькі хлеба, колькі атрымалі сёлета ў калгасе. На 649 працадзён усёй сям'ёй (маіх 198—у мяне дзіця грудное было, а то выпрацавала-б больш) мы атрымалі 49 пудоў і 10 фунтаў жыта, 18 пудоў 36 фунтаў пшаніцы, 31 пуд 24 фунты ячменю, 16 пудоў 13 фунтаў аўса, 4 пуды 31 фунт ільнасемя, 5 пудоў 8 фунтаў гароху, 13 пудоў 18 фунтаў субару і 165 пудоў 8 фунтаў бульбы.

Даход сям'і Лукашовых у калгасе расьцэньваецца як вышэйсярэдні. Усе, хто старанна працаваў у калгасе, хто імкнуўся прынесьці калгасу карысьць, не агінаўся гультаём,—усе тыя калгасьнікі атрымалі ад калгасу ўсё магчымае, каб жыць добра. Разьмеркаваньне ўраджаю ў калгасе сёлета паказала ня толькі калгасьнікам, але і аднаасобнікам, што толькі ў калгасе беднякі і сераднякі могуць палепшыць і сапраўды паляпшаюць свой дабрабыт.

Калгас імя Сталіна параўнаўча малады. 1931 год—год яго арганізацыі. Зараз калгас налічвае 20 гаспадарак, з ахопам пасеўнай плошчы ў 173 га. Але ўжо ў 1932 годзе калгасьнікі дабіліся бліскучых вынікаў сваёй работы. Выканаўшы і перавыканаўшы ўсе абавязкі перад дзяржавай, калгас разьмеркаваў ураджай. На працадзень прыпала 3 кгр. збожжавых, 129 грам гароху, 3 кгр. 610 грам сена, 4,84 кгр. бульбы і інш. і 22 кап. грашыма.

Калгас ударна рыхтуецца да веснавой сяўбы, паставіўшы ў цэнтр падрыхтоўкі павялічэньне ўраджайнасьці і задачу, пастаўленую правадыром нашай партыі тав. Сталіным,—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі.

Насеньне і страхавыя фонды ссыпаны. Інвэнтар адрамантаваны. Усё асноўнае, неабходнае для таго, каб выехаць у поле, зроблена. Справа за вясной. Ёсьць прыліў: пяць лепшых беднякоў і сераднякоў прынята ў калгас.

— А ўлетку такое было,—гаворыць Лукашова.—Мы копы кладзем, а яны (аднаасобнікі) ідуць сабе ў маліну. Гэй, вы, сякія-такія,—крычаць яны нам,—у вас губы ад працы пасмаглі, работнічкі! „А цяпер кажуць: „Несьвядомымі мы былі“. А мы з імі жывем такі дружна. Летась брыгадай жыта дапамаглі жаць аднаму, мужчыны коньмі дапамагаюць... Неўзабаве яны да нас усе прыдуць. Гуртом, талакой весялей жыць і працаваць. Уга, як весялей. Калі-б мяне зараз ды на палоску тую, то з нуды ня ведала-б, што і рабіць...

— Зараз няма чаго грашыць, мы, такі жывем ня кепска...—дадае яна.

Маланьня Лукашова вельмі хацела ехаць у Менск. Яна хоча пачуць тав. Гікало, Галадзеда, Шаранговіча, паслухаць вопыт працы лепшых ударніц і ўдарнікаў з другіх калгасаў.

— Шкада от, што Сталіна ня будзе...

Дармо шкадаваць цётачка, пабачым і Сталіна.

Мы штодзень бачым яго перад сабой у задачах, якія ставіць ён перад намі.

„Шлях да старой аднаасобнай гаспадаркі закрыт канчаткова“.

„Што датычыцца да самих калгасьнікаў, то яны памятаюць аб сіле і значэньні калгасаў для жанчыны, што толькі ў калгасе яны маюць магчымасьць стаць на роўную нагу з мужчынай. Без калгасу—няроўнасьць, а ў калгасе роўнасьць правоў. Хай памятаюць пра гэта таварышы калгасьніцы і хай берагуць яны калгасны лад, як вока сваё“.(Сталін).

І яны берагуць яго. І ніякая сіла ня зрушыць іх са шляху, па якім мы непераможна рухаемся наперад.

Маланьня Лушакова едзе ў Менск. **Зьмітрок Віталін.**

Трактарысткі абмяркоўваюць свой плян, Маскоўская вобласьць

Пробны выезд у поле

14-га сакавіка ў калгасе „Зьязда, Махіраўскага сельсавету, Полацкага раёну, быў зроблен пробны выезд у поле. Выезд паказаў, што калгас гатоў да сяўбы. За 10 хвілін усе калгасьнікі запрэглі коняй і выехалі на вызначанае месца. Плугі ў ліку 13 штук адрамантаваны.

Першымі выехалі Шэф Зьмітрок і Кухарэнак Кастусь. Насенныя і страхавыя фонды ў калгасе ссыпаны поўнасьцю і знаходзяцца ў добрым выглядзе.

Калгас гатоў да вясны.

Полацкі раён.

Шэф

„З калгаснага шляху я ніколі ня сыду“

Калгас „Новае жыцьцё“ Н.-Агародніцкага сельсавету, Слуцкага раёну, амаль адзін з першых у раёне скончыў сапраўды бальшавіцкую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. У нова- пабудованым сьвірне поўныя засекі ачышчанага гатунковага насеньня аўса, ячменю ды іншых культур.

У стайні паўнейшы парадак, усе коні добрыя.

Без капейкі крэдытаў, шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў калгас пабудаваў у мінулым годзе новую абору для кароў, стайню, сьвінарнік, сьвіран. Распачага пабудова дзіцячых яськяй і гаражу для машын і інвэнтару.

Калгас паслаў дэлегата Надзю Пыжрапартаваць Усебеларускаму зьезду калгасьнікаў-ударнікаў аб сваіх посьпехах.

18 сакавіка ў калгасе „Новае жыцьцё“ адбыўся агульны сход жанчын, на якім прысутнічала— намесьнік старшыні таварыства старых бальшавікоў—тав. Сьмідовіч. На сход прышлі і аднаасобніцы. Тав. Сьмідовіч расказала калгасьніцам і аднаасобніцам аб мерапрыемствах партыі па рабоце сярод жанчын і задачах, якія стаяць у галіне перабудовы сельскай гаспадаркі.

Быў наладжан абмен вопытам старых і новых калгасьніц. Калгасьніцы ў спрэчках заявілі: „нам цяпер шмат лепш жывецца, мы становімся заможнымі“.

Дэлегатка Ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў тав. т. Пыж Надзя расказала: „У калгас я ўступіла ў 1929 годзе пасьля ліста тав. Сталіна „Галавакружэньне ад посьпехаў“. Многія вышлі з калгасу, нас засталося толькі сем гаспадарак. Кулакі не давалі праходу, сьмяяліся, але мы працавалі. Працуючы брыгадзірам агароднай брыгады, я прыкладала ўсе сілы. Выпрацавала 256 працадзён. Атрымала 509 кілё жыта, 156 кілё яравых і 895 кілё бульбы. Гэтага хопіць мне на цэлы год. З калгаснага шляху я ніколі ня сыду.

Дэлегатка Надзя мае толькі 19 гадоў. Яе выгадавала маламоцная серадняцкая гаспадарка. Калгасьніцы даручылі ёй расказаць зьезду аб іх новым жыцьці.

А вось што расказала калгасьніца Мурашка Матруна.— Да ўступленьня ў калгас у мяне заўсёды не хапала хлеба. Дзеці мае былі пастухамі. У 1929 годзе ўступіла я ў калгас Жыцьцё маё палепшылася. Цяпер я з траіма дзецьмі падросткамі выпрацавала 689 працадзён. На гэтыя працадні атрымала 1371 кілё жыта, 446 кілё яравых і 2412 кілё бульбы. Хлеба хопіць на паўтары гады. Я зрабілася заможнай.

Уступіла Матруна ў калгас бяднячкай. Падатку ніколі не плаціла. Мела 2 га зямлі, карову, старэнькую хату і хлеў.

Калгасьніцы расказалі тав. Сьмідовіч аб тым, што ў іх ёсьць і такія як Бартошык Ганна. Маладая, здаровая жанчына выпрацавала толькі 13 працадзён. „Ня выпрацавала больш таму, што любіць пагрэцца ў садку летам, а зімой—на печы“—жартуюць калгасьніцы. З такімі як Бартошык калгасьніцы абяцалі павесьці жорсткую барацьбу, каб ні аднаго прагульшчыка ня было ў калгасе.

Сход аднадушна ўхваліў паслаць ліст тав. Сталіну і расказаць яму аб іх працы і новым жыцьці ў калгасе і аб тым, як яны робяць свой калгас перадавым, бальшавіцкім.

Ліст напісалі і паслалі.

Слуцкі р.

Я. Траяноўскі.

Узорная СТФ

На фэрме чыстата і парадак. Кожны станок разгароджан нявысокай адгародкай на дзьве часткі. У першай сьвіньня есьць, а ў другой сьпіць. Пабудавана сцэцыяльная сталоўка для групавога кармленьня сьвіней. Тры разы ў дзень мыецца сталоўка, станкі і карыты. Сьвінаматкі ў ліку 63 з 300 парасятамі ляжаць закапаўшыся ў сухую сьвежую салому.

Сьвінарка Малашэнка Маланка з замілаваньнем расказвае аб сваёй фэрме.

— Мы тры разы ў дзень вымываем станкі і карыты. Начавалі ўвесь час у сьвінарніку, калі сьвінаматкі пераселіся. У холад мы начамі ня выходзілі са сьвінарніку, накрывалі парасятак саломай, каб не памерзлі. У сонечныя дні мы выганяем сьвіней на двор, на прагулку, улетку парасятак часта мыем.

Малашэнка Маланка—лепшая ўдарніца гэтай фэрмы, яна выпрацавала 440 працадзён. Не адстае ад яе і Зьмітрэнка. Яны абедзьве працуюць на фэрме ўжо па два гады.

Прэміяльна-зьдзельная сыстэма аплаты, уведзеная на фэрме, вельмі заахвоціла ўсіх працаўнікоў. Раней сьвінаркі зараблялі па 37 працадзён у месяц, а пры зьдзельна-прэміяльнай сыстэме яны зарабляюць па 60 працадзён і больш. За мінулы месяц за захаваньне маладняка кожная сьвінарка атрымала па 40 працадзён, адыход зьніжан да $^3/_4$ проц.

Сьвіньні добра даглядаюцца, кормяцца тры разы ў дзень. За ўзорную працу фэрма атрымала прэмію па Ўсебеларускім конкурсе ў суме 250 руб.

Пляны здачы мяса ў лік 15-ці месячнага пляну за два кварталы перавыканан на 2 цэнтн. Плян гадавога апаросу выканан на 80 проц. СТФ паставіла перад сабой задачу ўкамплектаваць стада за лік маладняка, прадаць на рынку 60 падсьвінкаў вагой ня ніжэй як 70 кгр, кожны і апрача таго даць парася кожнаму калгасьніку, які ня мае сьвіней.

На фэрме сыстэматычна займаецца зоагурток, які ахапляе ўсіх работнікаў фэрмы. Усе працаўнікі фэрмы абвясьцілі сябе ўдарнікамі па захаваньні маладняка і выклікалі на сацспаборніцтва сьвінафэрму калгасу „Зара“.

Касьцюковіцкі р.

Брыгада: Архіпцоў, Зьмітрачэнка Прося, Крупадзерава, Сасонкіна, Малашэнка Маланка, Матросава і Булко.

Перамога ў сацспаборніцтве, на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы з Заходняй вобласьцю, павінна быць за намі!

Рэйд праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы

Генэральная праверка

„Неабходна разгарнуць работу па арганізацыі калгасьніц і работніц саўгасаў на актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні задач веснавой сяўбы, неадкладна праверыць ход падрыхтоўкі кадраў з калгасьніц на курсах калгаснага актыву і забясьпечыць сваячасовае адкрыцьцё дзіцячых палявых ясьляй, вядучы рашучую барацьбу з недаацэнкай ролі жанчын у сельскай гаспадарцы і неахайнымі адносінамі да справы вылучэньня жанчын на кіруючую работу і іх. „культурна-бытавога абслугоўваньня".

(З пастановы пленуму ЦК КП(б)Б

Вольная плошча каля нардому запоўнена фурманкамі, коньмі і людзьмі Над некаторымы дугамі разьвейваюцца чырвоныя сьцяжкі. На вазох ляжаць бораны, плугі і іншыя прылады— гэта калгасьнікі аднаасобнікі вёскі Відуйцы зрабілі пробны выезд у поле.

Калгасьнікам пробны выезд не навіна, яны выяжджалі і ў леташнім і ў пазалеташнім годзе. Аднаасобны сэктар выехаў на пробны выезд у першы раз, выехалі ўсе як адзін. Асобнай групай з чырвоным сьцяжком на пярэдняй фурманцы разьмясьціліся яны недалёка ад трыбуны.

Настрой ва ўсіх бадзёры. У пераменку з шапкамі на вазох мільгаюць чырвоныя, белыя хусткі жанчын, сярод іх лепшыя калгасьніцы ўдарніцы—Цурганава Наста, Баброва Мар'я, Сьцепанкова і іншыя, якія разам з калгасьнікамі выяжджаюць на ворыва.

Аднаасобніца Мар'я Зьміцранка папрасіла суседку паглядзець каня і сама, ня гледзячы на лужы вады, нацянькі хутка пабегла за сядзёлкам, які яна забыла. Вярнуўшыся, яна вінавата растлумачыла суседзям.

— Бачыце, удава я, мой конь зьбіты, слабы, цяжка мне ўправіцца аднэй.

— У калгас ідзі Мар'я—гавораць ёй жанчыны.

Партыйная ячэйка дала цьвёрдую дырэктыву да 15/III скончыць усю падрыхтоўчую работу да вясны і паміж 15 і 20 правесьці пробныя выезды.

На пробным выездзе ў нашым калгасе прысутнічаюць прадстаўнікі з суседніх калгасаў імя Карла Маркса і „Зары". Заўтра камісія з нашага калгасу накіруецца ў калгас імя Карла Макса для ўдзелу ў пробным выездзе.

Падстаўнікі разам з камісіяй агледзелі ўсіх коняй, інвэнтар і калёсы. Агляд паказаў, што ня зусім падрыхтаванай аказалася другая брыгада калгасьнікаў і аднаасобны сэктар, у якіх плугі не адрамантаваны.

Цікава адзначыць такі факт, што аднаасобнікі ўсе як адзін выехалі з сеўнямі на вазох ў той час, як у калгасьнікаў іх ня было, бо яны сеяць будуць ня рукамі, а машынамі.

На праведзеным тут-жа мітынгу як калгасьнікі, так і аднаасобнікі абавязаліся ў пяцідзенны тэрмін ліквідаваць усе недахопы.

Брыгада: Науменка, Крупадзёрава Марфа, Матросава і Кандратова.

Касьцюковіцкі р.

Падрыхтоўка да сяўбы ў аднаасобным сектары злачынна зрываецца

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы па аднаасобным сэктары ў Азярянскім сельсавеце ганебна зрываецца.

Аднаасобныя гаспадаркі сельсавету да 9 сакавіка яшчэ не ачысьцілі насеньня, не адрамантавалі сельска-гаспадарчы інвэнтар. Ніякай работы не праводзіцца і ў справе падрыхтоўкі каня да веснавой сяўбы.

Гэта—вынік апартуністычнай недаацэнкі з боку парт'ячэйкі, сельсавету ролі аднаасобнага сэктару ў сяўбе.

Сельсавет толькі дзівіў пляны сяўбы да кожнага двара, а зараз ніякай работы з адна собнікам не праводзіць. Масава-палітычная работа адсутнічае.

Сельсавет, партыйная ячэйка павінна зараз-жа мабілізаваць працоўных аднаасобнікаў на баявую падрыхтоўку насеньня, коняй і інвэнтару для сяўбы.

Рагачоўскі раён. **Ар. Лясны.**

Да вясны падрыхтаваліся

16-га сакавіка калгас імя Карла Маркса, Сялецкаўскага сельсавету, сьвяткаваў сваё трохгодзьдзе. Калгасьнікі падводзілі вынікі сваёй трохгадовай працы. І вынікі гэтыя цікавыя, яны выразна паказваюць рост і перавагі буйнай гаспадаркі над дробнай.

Калгас імя Карла Маркса арганізаваўся ў 1930 годзе, з 20 гаспадарак, а зараз ён налічвае 130 гаспадарак, амаль уся вёска калектывізана на ўсе 100 проц.

Калгас за тры гады свайго існаваньня пабудаваў новы сьвіран, стайню і абору.

Да вясны калгас поўнасьцю падрыхтаваўся, працоўная сіла разьбіта на 4 палявыя брыгады і адну жывёлагадоўчую. Інвэнтар адрамантован і замацован за брыгадамі, коні знаходзяцца ў добрым становішчы і таксама прымацаваны да брыгад. Насеньне ссыпана і ачышчана.

— Мы можам сеяць хоць заўтра—гавораць калгасьнікі. Жанчыны-калгасьніцы прымаюць ўдзел ва ўсёй падрыхтоўчай працы разам з калгасьнікамі. Брыгады заключылі спаборніцтва на лепшую і сваячасовую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы.

Лепшыя ўдарнікі ў часе сьвяткаваньня Кастрычніцкай рэвалюцыі былі прэміяваны. З 30 прэміяваных было 20 жанчын. Лепшымі ўдарніцамі сярод жанчын зьяўляюцца: Капылёва Фядора—сьвінарка, якая выпрацавала 459 працадзён, Шыпава. Аксюта, Баброва Мар'я і іншыя.

У гонар свайго трохгодзьдзя калгасьнікі адгрузілі харкаўскім калгасам насеннай бульбы 110 цэнтнэраў.

Разгорнутае сацспаборніцтва і энтузіязм саміх калгасьнікаў служыць зарукай таго, што пасеўная кампанія будзе праведзена сваячасова.

Касьцюковіцкі р.

Брыгада: Шандагіла, Навуменка, Себянкоў, Паялаў, Булко Вольга.

Як мы падрыхтаваліся да сяўбы

Камуна „Чырвоны Кранштадт" арганізавалася ў 1919 годзе з 15 гаспадароў. У мінулым годзе ў ёй было больш як 200 гаспадароў, вараз калі аддзялілася вёска Ветухна ў асобны калгас, засталося ў камуне 60 гаспадарак.

Ужо два гады як увялі дзевяціпольны севазварот. Насеньньне ссыпалі поўнасьцю згодна пляну. Не хапае насеньня аўсу. Дык яго замянілі ячмянём і грэчкай для абмену на авёс. Насеньне ўсё ачышчана. Інвэнтар поўнасьцю адрамантован. Дрэнна абстаіць справа толькі з цяглавай сілай.

Усяго ў камуне 38 коняй, з іх 18 коняй слабыя і яны больш стаяць чым працуюць. Няма яшчэ патрэбиага догляду за коньмі. У брыгадах існуе абязьлічка. Кормяць коняй толькі адным сенам, таму яны такія слабыя.

Калі распрацавалі адозву калгасьнікаў-ударнікаў з Усесаюзнага зьезду, то парашылі абавязкова коняй падправіць, для гэтага выдзялілі кармы для падмешкі коням. Конюх Лукашэнка выклікаў на сацспаборніцтва канюха Барысевіча на лепшы догляд коняй, каб сваячасова іх карміць, паіць і чысьціць. Пастанавілі прымацаваць коняй у брыгадах за калгасьнікам.

Абавязаліся забясьпечыць вывазку гною ў 20 дзён (да 5 красавіка).

Брыгадзір палявой брыгады № 2 Ахрамэнка выклікаў на сацспаборніцтва брыгаду № 1 па сваячасовай падрыхтоўцы да вясны і сваячасовай вывазцы гною.

Жанчыны вельмі актыўна выказваліся на сходзе, усяго выказалася 10 жанчын і пяць мужчын.

У камуне ёсьць добрыя ўдарніцы: Махавікова Ліда, Шунякова Пекла, Захарэнка, Харобрая Каця і інш. Іх прэміявалі мануфактурай.

На сходзе выступіла Пракаповіч— дачка раскулачанага, якая крычала і даводзіла, што камуна прыводзіць да гібелі, да голаду. Выступіўшыя камунары далі адпор кулачцы Пракаповіч, указалі ёй, што становішча камуны залежыць ад работы саміх калгасьнікаў, што сама Пракаповіч дрэнна працавала. Калі зьдзельшчына ня было ўведзена, то яна зусім на працу ня выходзіла. Пры раскідцы гною яна дрэнна працавала і яе работу прышлося перарабляць. Папала яна ў камуну таму, што замужам за батраком. Камунаркі кваліфікалі выступленьне Пракаповіча — як выступленьне клясава-варожае.

Камунаркі абралі на Ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў лепшую ўдарніцу камунарку Кацю Харобрую. Яна сапраўды заслужыла быць дэлегатам зьезду лепшых людзей сацыялістычных палёў.

Былая батрачка, актыўная працаўніца па соцыялістычнай перабудове вёскі, адна з арганізатараў у 1919 годзе камуны „Чырвоны Кранштадт". Зараз Касьцюковіцкі раённы камітэт партыі і РВК узьнялі хадайніцтва аб узнагародзе яе—як сапраўднага барацьбіта за справу сацыялізма, ордэнам працоўнага сьцягу.

Брыгада, Красьцялева Поля, Махавікова, Макарэнка, Федасей, Матросава.

Касьцюковіцкі. р

Злачынна зрываюць падрыхтоўку да вясны

На дэлегацкім сходзе Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі была складзена брыгада з жанчын-ударніц па падрыхтоўцы да сяўбы. Брыгада выехала ў калгас імя Сталіна і праверыла падрыхтаванасьць калгасу да сяўбы. Яна выявіла, што калгас імя Сталіна, Якаўлевіцкага сельсавету, ня поўнасьцю ссыпаў насеньне, рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару ў калгасе ідзе вельмі марудна. Толькі некалькі дзён таму назад праўленьне калгасу павыцягвала плугі з-пад сьнегу. Да рамонту калёс і ня думалі прыступаць.

Коні і каровы знаходзяцца ў жудасным становішчы, каровы, маладняк і нованароджаныя цяляты знаходзяцца ў адным памяшканьні, прычым стаяць на мёрзлых кучах гною і ўсе надта худыя. Такое зьявішча старшыня калгасу Красоўскі і яго намесьнік Гараськаў тлумачаць аб'ектыўнымі прычынамі, з усьмешкамі, быццам гэта так і павінна быць

У аборы вее вецер і надта холадна. Ня лепшае становішча ў калгасе і з коньмі. Яны вельмі дрэнна даглядаюцца, ніколі ня чысьцяцца, на шэрсьці коняй наліплі кучы гною і калгасныя коні падобны хутчэй на авец з сукрыстай поўсьцю, чым на коняй. Коні да брыгад паасобных калгасьнікаў не прымацаваны і ў гэтай справе пануе поўная абязьлічка.

Разам з прыбыцьцём брыгады калгасьнікі прыехалі з лесавывазак, адпрэглі коняй і—спацелых кінулі без усякага догляду. Калі гэта заўважыла брыгада, то не знайшлося і вінаватага. Гэта неадзін прыклад. Такія прыклады ў калгасе імя Сталіна здараюцца кожны дзень.

На пытаньне брыгады, колькі ўжо адсартавана насеньня, Красоўскі кажа: „100 пудоў," яго намесьнік—80, кладаўшчык—210 пудоў і загадчык гаспадаркай—111 пудоў. Так і не ўдалося выявіць, колькі ў калгасе адсартавана насеньня. Гэта таму, што ў калгасе адсутнічае ўсялякі улік, пануе безгаспадарчасьць.

Вясна ўжо на дварэ, чакаць няма чаго. Трэба прыцягнуць да адказнасьці вінаватых Гараськава і Красоўскага і паставіць ў кіраўніцтва калгасам людзей здольных па, бальшавіцку праводзіць дырэктывы партыі і ўлады ў жыцьце.

С. Мяжэвіч.

Якаўлявічы, Арш. р.

Тав. Дзенеш Юл., удар. к-су „Беларуская вёска", дэлегат Усебел. зьезду Лезьнян. р.

Праверка калдагавораў

У часе праверкі калдагавораў мабілізуем актыўнасьць работніц на выкананьне пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) на далейшае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на выкананьне прамфінпляну 1933 году.

Палепшыць якасьць прадукцыі

Пад знакам мабілізацыі рабочых мас на выкананьне прамфінпляну, і яшчэ большага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рабочыя і работніцы фабрыкі „Кастрычнік" шырока разгарнулі работу па праверцы калдагавору. Акрамя фабрычнай часовай кантрольнай камісіі вылучана 7 цэхавых. Арганізавана 25 праверачных брыгад, якія правяраюць абавязкі, узятыя па калдагавору.

Брыгада, якая праверыла работу сацбытавога сэктару, выявіла шмат дсягненьняў. За 1932 год было накіравана на курорты 72 рабочых, у дом адпачынку 336, у начны санаторы 29. 176 дзяцей работніц наведваюць ясьлі і знаходзяцца там круглую пяціднёўку. Толькі ў выходны дзень маці забірае сваё дзіця дамоў. У дом швэйнікаў уселена 45 рабочых сем'яў, у інтэрнат моладзі—37.

У другім агрэгаце пад гофманскімі прэсамі зроблена вэнтыляцыя, дзякуючы чаму ачышчаецца паветра ў цэху.

Але мала яшчэ зроблена сацбытавым сэктарам на выкананьні санмінімуму.

На фабрыцы ўраўнілаўка ў зарплаце амаль зьнішчана. Але ёсьць многа недахопаў. Няма дакладнага ўліку ў гаспадарча-разрахунковых брыгадах, няма ўліку эканоміі фарнітуры і невядома колькі кожная брыгада дае эканоміі.

Вузкім месцам на фабрыцы зьяўляецца якасьць прадукцыі. За студзень гэтага году страты ад браку складалі 447 руб., а ўтрымана ад бракаробаў толькі 36 руб. Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал і ўсе рабочыя не праявілі выстарчальнай увагі да выяўленьня бракаробаў.

Брыгада, якая праверыла, як выконваюцца абавязацельства па якасьці прадукцыі ў трэцім агрэгаце (2-й зьмены) выявіла, што дакладнага ўліку пераробак не вялося. Весткі ёсьць толькі за сьнежань 1932 году. Паводле гэтых вестак ёсьць многа пераробак. Праўда, за апошні час начальнікі цэхаў самі правяраюць па агрэгатам якасьць прадукцыі і работу кантралёраў. Яны праводзяць разам з прафарганізацыяй цэхаў агульныя сходы, дзе завастраецца пытаньне аб зьнішчэньні браку. Ёсьць некаторы зрух у гэтай справе—паляпшаецца якасьць прадукцыі.

Але гэтага яшчэ зусім мала. Задача кожнай работніцы, кожнага рабочага рашуча змагацца за якасьць прадукцыі, давесьці брак да мінімуму. Праверка калдагавору, якая выявіла ўсе недахопы, павінна дапамагчы канчаткова ліквідаваць брак. Чырвонасьцяжная фабрыка „Кастрычнік" павінна даць спажыўцу добраякасную прадукцыю і гэтым самым зьнізіць сабекошт.

Яўх. Гаварушка.

Менск



Т-ва. Талкевіч – лепшая ўдарніца, герой пяцігод., выткворчы стаж—35 год, вылучана загадчыкам каробачнага цэху (ф-ка „Пралетарская Перамога", Барысаў).

Пляцоўка патрабуе нагляду з боку фабкому

На дзіцячай пляцоўцы Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі вельмі холадна. Памяшканьне не адрамантавана. На галовы дзяцей са сталі сыплецца атынкоўка.

Інвэнтаром пляцоўка поўнасьцю не забясьпечана. На 48 дзяцей ёсьць толькі 4 сталы. Многім дзецям прыходзіцца есьці на падлозе. Няма вешалкі, вопратка валяецца на падлозе, бялізна—на ложках. Гэта стварае антысанітарнае становішча.

Ручнікі вельмі брудныя, не адрозьніш, што вісіць на сьцяне—ці кавалак сажы, ці ручнік. Ніхто з кіраўніц не паклапаціўся зьнішчыць антысанітарнае становішча. Ня дзіва, што з пляцоўкі ёсьць адліў дзяцей.

Фабрычныя арганізацыі павінны неадкладна заняцца становішчам пляцоўкі і прывесьці яе ў належны парадак.

С. М—ч.

Аршанскі раён.

т. Дубецкаая Ева—ударніца даярка. Дэлегат раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў, Барысаўскі раён.

Мэтадамі сацспаборніцтва разгарнулі работу па праверцы

На заводзе імя Варашылава былі арганізаваны 63 брыгады па праверцы калгадавору і збору прапаноў. Паміж брыгадамі і цэхамі разгорнута сацспаборніцтва. Рамонтна-будаўнічы цэх выклікае на сацспаборніцтва сьлясарна-зборачны на лепшае правядзеньне праверкі і шырокі ўдзел у рабоце. У праверачных брыгадах удзельнічае 30 проц. работніц.

У часе праверкі выяўлена рад недахопаў і невыкананьне паасобных пунктаў калдагавору: несваячасовая выдача рабочым спэцвопраткі, тэхнармаваньне не наладжана. Па лініі ЗРК рабочыя няпоўнасьцю забясьпечаны гароднінай, бульбай, дровамі. Пасьля перавыбараў заўкому палепшылася работа сталоўкі, але ў-ё-ж яшчэ многа недахопаў: памяшканьне не прыстасавана, у сталоўцы брудна, абеды незаўсёды добраякасныя.

Па тэхніцы бясьпечнасьці да гэтага часу яшчэ ня ўсё зроблена. Ня ўсе варштаты агароджаны.

Мала зьвернута ўвагі з боку адміністрацыі на павышэньне кваліфікацыі работніц і тэхнічнай вучобы. На заводзе больш паловы новага тэхнічнага абсталяваньня, якое трэба асвоіць. Ёсьць выпадкі, калі работніцы працуюць па тры гады на адным і тым жа разрадзе.

На падставе выяўленых недахопаў кожная брыгада ўнесла свае прапановы да новага калдагавору. Брыгады патрабуюць сваячасовай падачы дэталяй і нарадаў да варштатаў, лепшага інструктажу рабочых з боку тэхнічніга пэрсаналу. Па рабоце сталоўкі ўнесены прапановы аб пашырэньні памяшканьня, увядзеньні паблюднай сыстэмы, стварыць стол ударніка і стол ІТР, стварыць куток дыэтхарчаваньня. Пункт аб пашырэньні памяшканьня сталоўкі ўжо праводзіцца ў жыцьцё.

Брыгады патрабуюць ад адміністрацыі выкананьня ўсіх прапаноў рабочых па калдагавору і прыцягненьня вінаватых у парушэньні калдагавору да адказнасьці.

Трэба адзначыць, што, ня гледзячы на актыўны ўдзел рабочых і работніц у праверцы, усё-ж такі заводзкія арганізацыі ня сумелі ў гэту важную палітычную кампанію ўцягнуць усю рабочую масу заводу.

Н. З.

Менск

Давесьці работу па праверцы да канца

На фабрыцы „Дзьвіна" была разгорнута шырокая масавая работа па праверцы калдагавору. Па ўсіх цэхах і зьменах адбыліся сходы рабочых і работніц па гэтым пытаньні. У праверцы калдагавору прымала удзел 65 брыгад, з ахопам 315 работніц і рабочых.

13 сакавіка адбыліся вытворчыя нарады па ўсіх цэхах і зьменах з дакладамі загадчыкаў цэхаў аб выкананьні прамфінпляну за студзень-люты і першую дэкаду сакавіка. З дакладамі выступалі праверачныя брыгады.

На сходах выказалася шмат работніц. Яны ўказалі на непаладкі ў вытворчасьці, унесьлі цэлы рад практычных прапаноў.

Але побач з разгорнутай масавай работай па праверцы калдагавору яшчэ ёсьць многа недахопаў. Агульна-фабрычная камісія па праверцы калдагавору пад кіраўніцтвам тав. Жыткевіча бязьдзейнічала. Пленум фабкому вывеў яго са складу камісіі.

Старшыня зьменкому групы „А" тав. Раманава займаецца „очковтирательством". Яна напісала артыкул у шматтыражку ад 12 сакавіка аб тым, што работа брыгады ў асноўным скончана. На справе-ж аказалася, што ні адна брыгада не змагла зрабіць справаздачы аб сваёй рабоце.

Старшыня зьменкому групы „Б" тав. Окунева не правяла як належыць падрыхтоўкі да вытворчых нарад. З-за гэтага нарады па вацерных цэхах былі сарваны, а ў астатніх цэхах мала зьявілася рабочых. Старшыня зьменкому групы „В" Бабахін не падрыхтаваў брыгад да вытворчай нарады. Усяго тры брыгады рабілі справаздачу. З боку ІТР і служачых, якія былі прымацаваны для дапамогі рабочым брыгадам, ня было праяўлена патрэбнай ініцыятывы ў гэтай рабоце. Некаторыя, як Кац і Хайкін, адмовіліся зусім працаваць. Адміністрацыя фабрыкі зусім ня прымала ўдзелу ў ходзе праверкі калдагавору.

Зараз перад намі стаіць задача разгортваньня работы па збору рабочых прапаноў да новага дагавору. Трэба абагуліць усе вынікі праверачных брыгад і давесьці работу да канца.

Т. Собалева.

Віцебск

Тав. Норбут — лепшая ўдарніца, герой пяцігодкі, вытворчы стаж 24 гады, бракоўшчыца ф-кі „Пралетарская Перамога"

РАБКОРКІ, ПІШЭЦЕ У ЧАСОПІС АБ ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ КОЛДАГАВАРОЎ.

ГИВ Ст.-Ц.

Канкрэтнымі справамі дапамаглі калгасу

Пленум ЦК „абавязвае ўсе прамысловыя арганізацыі, заводзкія ячэйкі карэнным парадкам і неадкладна перабудаваць шэфскую работу, бязьлітасна выпраўляючы парадную шуміху, бюракратычнае верхаглядзтва ў рабоце па шэфстве"

(З пастановы пленуму ЦК КП(б)Б

Брыгада рабочых і работніц у дапамогу калгасам

Рабочыя і работніцы шчотачнай фабрыкі імя Крупскай зразумелі бальшавіцкую задачу падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. У дапамогу падшэфнаму Навасадзкаму сельсавету была выслана брыгада.

За дзесяць дзён брыгада прарабіла вялікую работу па дапамозе ў складаньні вытворчых плянаў у калгасах „Пралетары", „Ленінскі прызыў", „Навасады", „Чырвоная Беларусь", „Новы быт".

Брыгада правяла культурна-масавую работу сярод калгасьніц.

Праведзены гутаркі аб значэньні 8 сакавіка, аб выніках першай пяцігодкі і задачах другой, аб задачах калгасьніка ў падрыхтоўцы да сяўбы. Калгасьнікі і калгасьніцы былі вельмі задаволены работай выязной брыгады.

У калгасе „Пралетары" поўнасьцю ссыпана насеньне, якое добра захоўваецца; заканчваецца рамонт інвэнтару. Ёсьць і вялікія недахопы. Цягавая сіла абязьлічана. Дрэнна даглядаецца жывёла—бывалі выпадкі, калі яна была ня кормлена і няпоена цэлымі днямі. Даглядчыца авечак Кухарчык вельмі дрэнна выконвае свае абавязкі. Фураж выдаваўся без кантролю. Праўленьне калгасу „Пралетары" доўга не рэагавала на гэтыя агідныя зьявішчы. Толькі пры садзейнасьці выязной брыгады шчотачнай фабрыкі праўленьне калгасу зьняло Кухарчык з работы, а яе мужа—вартаўніка, які даіў калгасных кароў, забіраючы сабе малако, таксама зьнялі з работы. Але гэтага мала, яго трэба аддаць пад суд.

Брыгада выявіла поўную адсутнасьць культурна-масавай работы ў калгасе. Ленкутка ня было. Калгасьнікі амаль зусім ня чыталі газэт. Добра толькі, што ў калгасе рэгулярна выходзіць насьценгазэта, якая змагаецца за свае часовую падрыхтоўку да сяўбы.

Самы адсталы — гэта калгас „Новы быт", які яшчэ не падрыхтаваўся да сяўбы. Насеньне ня ссыпана. Інвэнтар не адрамантаваны.

Інакш стаіць справа ў калгасе „Ленінскі прызыў". Тут абязьлічка ліквідавана. За цягавую сілу адказваюць прымацаваныя. Калгас ужо падрыхтован да сяўбы. Ссыпаны насенныя фонды. Рамонт інвэнтару скончан яшчэ 12 сакавіка. Калгас „Ленінскі прызыў" лічыцца адным з лепшых у Навасадзкім сельсавеце.



т. Шэндэлева Аўдоцьця.— лепшая ўдарніца камуны „Прагрэс" Лёзьнянскага раёну. Дэлегат Усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

Калгас „Чырвоная Беларусь" ідзе першым у сельсавеце па ўсіх мерапрыемствах. Падрыхтаван да сяўбы таксама і калгас „Навасады".

Вось асноўныя недахопы і дасягненьні ў калгасах падшэфнага сельсавету, якія зьявіла брыгада рабочых і работніц шчотачнай фабрыкі. Задача шэфаў—дапамагчы адстаючым калгасам у ліквідацыі прарыву, каб стаць у радох перадавых у справе падрыхтоўкі да сяўбы.

Менск.

Яўхім Гаварушка.

Калгасы падшэфнага сельсавету падрыхтаваны да сяўбы

Пад кіраўніцтвам партарганізацыі рабочыя і работніцы фабрыкі „Камунарка" (Менск) прарабілі значную работу па гаспадарчым умацаваньні калгасаў падшэфнага Бараўскога сельсавету.

У падшэфныя калгасы накіраваліся рабочыя брыгады, якія апрача, палітыка-выхаваўчай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў прымалі ўдзел у практычнай рабоце калгасаў. Брыгада рабочых працавала ў калгасах 8 дзён і адрамантавала ўвесь няспраўны інвэнтар.

Для правядзеньня 8 сакавіка ў падшэфныя калгасы былі накіраваны жаночыя брыгады, якія прынялі ўдзел у ачыстцы насеньня і падрыхтоўцы да раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў.

Праводзіліся вечары зьмычкі рабочага калектыву фабрыкі з падшэфнымі калгасамі, на якіх рабочыя дзяліліся вопытам работы, перанясеньнем лепшых мэтадаў—соцспаборніцтва і ўдарніцтва з фабрыкі на сацыялістычныя палі. У выніку ўмела пастаўленай работы па шэфстве з боку фабрыкі, калгасы Бараўскога сельсавету забясьпечаны да веснавой сяўбы ачышчаным насеньнем. Падрыхтован да работы інвэнтар, цягавая сіла і фураж. Калгасьнікі разьбіты на рабочыя брыгады, за якімі ўжо цяпер замацован неабходны інвэнтар і цягавая сіла.

Улічваючы добрую падрыхтаванасьць калгасаў Бараўскога сельсавету да бальшавіцкай сяўбы, гарком КП(б)Б даў сельсавету 13 дадатковых месц на раённым зьлёце калгасьнікаў-ударнікаў.

У гонар раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў калгасы падшэфнага сельсавету арганізавалі продаж дзяржаве збожжа.

Менск

Н. З.

Я. Ідэльчык.

Шлях Агапы Ванзонак

Ванзонак Агапа памятае гарачае лета, смагу... Яна сядзела на прызьбе сваёй трухлявай хаты ды думала аб нечым, тады ж Міхась гарадзкі падбег да яе ды крыкнуў:

— Агапка, рэвалюцыя!..

Адкуль ведаць Агапе, што значыць гэта слова. Яна яшчэ зусім маладая была, усяго 14 гадоў, але толькі нутром пачула бадзёрасьць, жаданасьць, бо з вялікай радасьцю крычаў пра гэта Міхась-мэталіст.

У той час Агапа ўжо батрачыла ў кулака Крэса. Толькі гарачае сонца пачынала паўзьці ца галубым, ясным небе, праменьні ўрываліс праз маленькія вакенцы і яе сухлявая матка пачынала шэптам будзіць:

— Агапка, уставай дачушка, ужо на працу ідуць...

Неахвотна падымалася Агапа працірала вочы, яна ведала, што цяпер толькі 4 гадзіны, ведала і тое, што цяпер дзеці Крэса толькі перавярнуліся на другі бок і моцным, бесклапатлівым сном сьпяць...

Так цягнуліся дні цяжкай працы. Агапа расла, дужылася і пачынала разумець хто такі Крэс.

Час кур'ерскім цягніком імчаўся ўперад. 1930 год. Пачынаецца калектывізацыя.

З гораду прыяжджае брыгада арганізоўваць у вёсцы Мглё калгас.

У хаце-чытальні поўна народу, сход. Старыя, маладыя, жанчыны, мужчыны занялі маленькі пакой.

У паветры калыхаўся густы дым самасейнай табакі.

Агапа таксама прышла на сход. Нясьмела села ў кутку і чакала чагосьці надзвычайнага.

На парадку дня стаяла адно пытаньне: „як палепшыць жыцьцё беднякоў, серадняком, вызваліць батракоў ад кулацкай кабалы".—

Дакладчык доўга і вельмі цікава гаварыў. Часта перарывалі яго выгукамі Крэсы. Яна, Агапа, сядзела ціха ў кутку, зачырванелася і галавы не падымала, а калі дакладчык успомніў прозьвішча Агапы і яе эксплёататара Крэса, з кулацкага кутка падняўся гікат, гул.

Спрачаліся доўга, крычалі бабы мглёўскія.

Пачалі запісваць у калгас. Падыходзілі да стала, бралі аловак ды нязвыкшыя рукі выводзілі каракулямі свае прозьвішчы.

Агапа нясьмела падышла да стала. Пісаць яна ня ўмела.

— Хопіць! Папрацую слабодна. Дыхну вольнымі грудзьмі.

...Крэс сядзеў у кутку, вочы яго наліваліся воўчай крывёю.

Арганізаваўся калгас. 7 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак склалі калгас „Праца", вёскі Мглё, Юраўскага сельсавету. Падыйшла першая вясна калгасу „Праца". І Агата выехала ў поле з плугам і пачала араць густа заросшыя пустазельлем межы.

Бабы-кулачкі дагаварыўшыся кінуліся біцца з Агапай.

А кулацкае ахвосьце і песеньку склала:

„А вясной на полі,
Што там рабілася—
Ванзонак Агапа
З Кацярыняй білася".

І доўга яны яе спявалі і цкавалі Агапу Ванзонак.

Засеялі і ўбралі першы калгасны ўраджай. І зноў 13 заяў у калгас ад беднякоў і серадняков. Колгас расьце і мацнее. Прышла бальшавіцкая вясна апошняга году першай пяцігодкі. Зноў уборка. Калгас добрасумленна выканаў свае абавязкі перад дзяржавай. Прыступілі да разьмеркаваньня ўраджаю. У сям'і Агапы ўсе ўдарнікі; выпрацавалі 780 працадзён, а яна сама—300. Увесь час працавала ў паляводчай брыгадзе і атрымала Агапа жыта, ячменю, бульбы і грашыма 200 руб. А дома карова ёсьць і сьвіньня.

— Ніколі я так ня жыла, як у калгасе,—кажа Агапа,—толькі калгас пазбавіў мяне ад Крэсавай кабалы.

І час хутка ідзе ўперад.

Надыходзіць падрыхтоўка да першай вясны другой сацыялістычнай пяцігодкі.

Калгас рыхтуецца: рамонт інвэнтару і збруі поўнасьцю скончылі 10 сакавіка, насеньне ўжо ссыпана і ачышчана, таксама ссыпан страхавы фонд. Конскае пагалоўе ў поўным парадку, а рамя трох, якіх паставілі на адкорм. Забраніяван для коняй кармовы фонд з разьліку: на аднаго каня два цэнтнэры канцэнтраваных і 6 грубых кармоў.

У 1932 годзе новая, вялікая старонка ў жыцьці Агапы—яна ўступіла ў ленінскую партыю.

* * *

За добрую работу калгас „Праца" атрымаў мандат на раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў.

Каго-ж паслаць? Факт, што лепшую ўдарніцу-калгасьніцу—Ванзонак Агапу. Яна адрапартавала на зьлёце. Як ёй даручылі: „Усё ў парадку. Чакаем загаду партыі і ўраду выйсьці ў поле".

Смалявічы.

Работніцы ў дапамогу падшэфнаму сельсавету

Брыгада дэлегатак Крычаўскага цэмэнтнага заводу выяжджала ў падшэфны Зарубіцкі сельсавет для праверкі падрыхтаванасьці калгасаў да сяўбы.

У калгасе „Чырвоны сормавец" брыгада правяла дэлегацкі сход, арганізавала жаночыя брыгады па праверцы гатоўнасьці калгасаў да сяўбы. Складзены жаночыя брыгады па зборы попелу і па падрыхтоўцы да адкрыцьця ясьляй. Па ініцыятыве калгасьніц арганізован продаж дзяржаве каля 20 пудоў збожжа.

Брыгада з лепшых ударніц-калгасьніц наведала 8 сакавіка цэмэнтны завод. Там яны рапартавалі цэмэнтніцам аб гатоўнасьці падшэфнага сельсавету і калгасаў да сяўбы. Брыгада азнаёмілася з заводам і арганізацыяй працы, арганізацыяй сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Яна перанясе лепшыя вопыты сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў свае калгасы.

Галя.

ГПБ Ст.-Кр.

ПРА ВЫТВОРЧУЮ БРЫГАДУ

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 9/III-33 году

Асноўным і рашаючым зьвяном у справе павышэньня ўраджайнасьці, узмацненьня сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны, палітычнага і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца пастаянная вытворчая брыгада.

Пастаянная вытворчая брыгада будзе вырашаць посьпехі веснавой сяўбы, ад яе работы будуць залежаць вынікі барацьбы за высокі ўраджай і даход калгасаў і калгасьнікаў, ператварэньне ў жыцьцё лёзунгу тав. Сталіна „зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі".

ЦК і СНК адзначаюць, што партыйныя савецкія і зямельныя арганізацыі недаацанілі палітычнага значэньня пастаяннай вытворчай брыгады, у выніку чаго летась ва многіх калгасах БССР груба парушаліся дырэктывы партыі аб арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад.

ЦК і СНК п а с т а н а ў л я ю ц ь:

1. Прапанаваць Наркамзему райкомам і гаркомам, РВК і МТС замацаваць у колгасах на 1933 год тыя брыгады, якія захаваліся ў сваім складзе і выконвалі ўсе асноўныя сельска-гаспадарчыя работы на працягу ўсяго мінулага году. Арганізаваць да 25 сакавіка 1933 году пастаянныя вытворчыя брыгады ў тых калгасах, у якіх яны ня былі арганізаваны ў мінулым годзе, або распаліся пры пераходзе ад веснавой сяўбы да ўборкі.

2. Выдзеліць ва ўсіх калгасах пастаянным паляводчым брыгадам зямельныя вучасткі ў палёх севазвароту, замацаваўшы за кожнай брыгадай вытворчы вучастак на тэрмін севазвароту. Зямельныя вучасткі павінны вызначацца па магчымасьці ў суцэльным масыве, або ў невялікай колькасьці вучасткаў, якія знаходзяцца на блізкай адзін ад другога адлегласьці, улічваючы пры гэтым асаблівасьці кожнага паасобнага колгасу (разьмяшчэньне зямельных ужыткаў, месца сядзібных вучасткаў калгасьнікаў і г. д.).

3. У дробных калгасах, якія аб'яднаюць менш 15 гаспадарак, пастаянных вытворчых брыгад у паляводстве не арганізоўваюць. У гэтых калгасах асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на правільную расстаноўку людзей і на замацаваньне лепшых калгасьнікаў за найбольш адказнымі работамі (работа на машынах, апрацоўка глебы, сяўба рукамі, догляд жывёлы і г. д.). Кіраўніцтва паляводзтвам ў гэтых калгасах павінна ажыцьцяўляцца старшынёю калгасу.

4. Для забесьпячэньня большай манэўранасьці пастаянных брыгад і апэрацыйнага кіраўніцтва брыгадай з боку брыгадзіра, брыгады не павінны быць празьмерна грамодзкімі. Улічваючы вопыт лепшых калгасаў, ЦК і СНК лічаць мэтагодным устанаўляць пастаянны склад калгасьнікаў у брыгадзе у сярэднім 30—40 чалавек.

Укамплектаваньне калгасьнікамі паляводчых брыгад павінна забясьпечыць максымальна роўнапружанасьць працы ў брыгадзе і паміж брыгадамі на працягу ўсяго сельска-гаспадарчага пэрыяду.

5. Разьмеркаваньне працаздольнага складу калгасьнікаў па брыгадах павінна праводзіцца так, каб у першую чаргу былі забясьпечаны лепшымі калгасьнікамі паляводчыя і жывёлагадоўчыя брыгады, асабліва для найбольш адказных работ (сяўба, уборка, малацьба, апрацоўка глебы, догляд і дзеньне кароў, догляд сьвіней).

6. Праўленьнем калгасаў замацаваць за кожнай брыгадай рабочых коняй, неабходны інвэнтар і сродкі вытворчасьці на цэлы год, перадаўшы іх брыгадзірам па вопісу. Выдзеленыя брыгадзе машыны і рабочыя коні замацаваць унутры брыгады за паасобнымі калгасьнікамі, якія (кожны паасобку) нясуць поўную адказнасьць за захаванасьць замацаваных за імі машын і інвэнтару. Да кожнага каня панінна быць прымацавана збруя і, як правіла, на ім павінен працаваць на працягу ўсяго сельска-гаспадарчага пэрыяду толькі той калгасьнік, да якога ён прымацован. Ускласьці адказнасьць за захаваньне, беражлівыя адносіны да каня і свячасовае яго кармленьне, а таксама за стан вупражы,—на калгасьніка, да якога конь і вупраж прымацаваны, і на конюха, які даглядае коняй.

7. Пастаянная брыгада нясе поўную адказнасьць за выкананьне ўсіх сельска-гаспадарчых работ і агратэхнічных мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці на замацаваным за ёю вытворчым вучастку, пачынаючы з падрыхтоўкі глебы і да ўборкі, абмалоту, пераапрацоўкі, здачы дзяржаве прадукцыі і захаваньне ўраджаю.

8. Падкрэсьліваючы асаблівае значэньне правільнай расстаноўкі рабочай сілы ўнутры брыгады для свячасовага і пасьпяховага выкананьня ўсіх работ на вучастку брыгады, забараніць каму-б там ні было праз галаву брыгадзіра ўмешвацца ў апэрацыйную работу брыгады і перакідаць з аднэй брыгады ў другую конскую сілу, машыны і калгасьнікаў бяз ведама брыгадзіра.

Для ўзмацненьня адказнасьці брыгады і зацікаўленасьці яе ў барацьбе за выкананьне даручаных ёй работ і за ўздым ураджайнасьці устанавіць, што пры атрыманьні брыгадай ураджаю вышэй сярэдняга па калгасу—брыгадзе робіцца налічэньне працадзён у межах да 20 проц. усёй

Заняткі агратэхнічнага гуртка ў камуне „Прагрэс", Лёзьнянскі раён.

колькасьці выпрацаваных ёю працадзён з адначасовым зьніжэньнем у тых-жа разьмерах тым брыгадам, якія далі ўраджай ніжэй сярэдняга па калгасу.

9. Абавязаць усе РВК, райза, МТС, сельсаветы і парт'ячэйкі не пазьнёй першага красавіка 1933 году распрацаваць і даць усім брыгадам гадавыя і вытворчыя заданьні для правядзеньня ўсіх работ на працягу ўсяго году. У гэтых заданьнях павінен быць канкрэтна паказан аб'ём заданьня, тэрмін выкананьня работы, увесь комплекс агратэхнічных мерапрыемстваў, заданьня па ўраджайнасьці з улікам асаблівасьці кожнага асобнага вучастку, а таксама колькасьць працадзён, якая будзе налічана брыгадзе за выкананьне ўсяго вытворчага заданьня, звыш якой брыгадзір ня мае права налічваць працадні калгасьнікам.

10. У мэтах шчыльнай увязкі работы брыгады з трактарнымі атрадамі МТС, устанавіць такі парадак, пры якім плян гадавых работ вытворчых вучасткаў МТС абавязкова даводзіцца да кожнай вытворчай калгаснай брыгады. У адпаведнасьці з аб ёмам работ МТС, што выконваецца на вытворчым вучастку брыгадай, устанаўляецца яе гадавое заданьне.

11. Падкрэсьліваючы асаблівую ролю брыгадзіра, як арганізатара калгаснай вытворчасьці, ЦК і СНК прапануюць Наркамзему, усім РК і РВК замацаваць на рабоце апраўдаўшых сябе ў мінулым годзе брыгадзіраў. Высоўваць на работу ў якасьці брыгадзіраў лепшых калгасьнікаў-ударнікаў, клясава-праверaных і здольных на справе арганізаваць масу калгасьнікаў на пасьпяховае выкананьне задач партыі па палітычным і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

12. Брыгадзір нясе поўную адказнасьць за работу ўсёй брыгады, расстаўляе калгасьнікаў на рабоце, прымае ад іх выкананую работу, налічвае працадні і запісвае іх у працоўныя кніжкі калгасьнікаў. Устанавіць такі парадак, што дрэнную па якасьці работу брыгадзір ня прымае і зусім не налічвае калгасьнікам за яе працадні.

13. Пастаянная брыгада павінна стаць цэнтрам палітычна-масавай і культурнай работы ў калгасе, таму ЦК і СНК прапануюць усім РК і РВК, сельпартячэйкам і сельсаветам разгарнуць работу брыгадных вытворчых нарад, арганізаваць выхад брыгадных штодзенных газэт, асабліва ў час веснавой сяўбы. Брыгадная газэта павінна весьці рашучую барацьбу з лодырамі, прагульшчыкамі і шкоднікамі і мабілізоўваць калгасьнікаў на аснове разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва на справу найбольш пасьпяховага і ўдарнага правядзеньня веснавой пасеўкампаніі.

Культпропу ЦК сумесна з Наркамземам выдаць да веснавой пасеўнай кампаніі макет брыгаднай штодзеннай газэты.

14. ЦК і СНК прапануюць усім РК і РВК, партячэйкам і сельсаветам забясьпечыць канкрэтнае кіраўніцтва і практычную дапамогу праўленьням калгасаў у арганізацыі брыгад, ачыстцы іх ад кулацкіх і клясава-варожых элемэнтаў.

15. Навукова-дасьледчаму калгаснаму Інстытуту і Дзяржаўнаму Выдавецтву Беларусі не пазьней 1-га красавіка выдаць масавым тыражом папулярную брашуру аб арганізацыі працы ў пастаянных вытворчых брыгадах у калгасах.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД
Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ

Абавязаліся на 20 проц. павысіць ураджайнасьць

У часе падрыхтоўкі да 8 сакавіка ўдарніцы інтэрнацыянальнага калгасу „Чырвоны араты"

т. Нечаева—конюх-ударніца, прэміявана 3 разы за добры догляд коняй. (Камуна К. Маркса Ц. Ч. О.).

арганізавалі аграгурток, каб набыць веды для павышэньня ўраджайнасьці калгасных палёў. Калгасьніцы паставілі перад сабой задачу—павысіць ураджайнасьць на 20 проц. Гуртком ахоплены ўсе калгаснікі і калгасьніцы. Заняткі праходзяць рэгулярна.

У калгасе ёсьць жаночая брыгада па зборы попелу, якая ўжо сабрала 18 тон попелу. Брыгада выклікала на сацспаборніцтва па лепшым зборы попелу суседні калгас „Новае жыцьцё". Выклік прынят. Зараз сацспаборніцтва дзьвёх брыгад абодвух калгасаў у разгары.

Трэба адзначыць, што, ня гледзячы на актыўнасьць жанчын калгасаў „Чырвоны араты" і „Новае жыцьцё", партыйная ячэйка амаль ніякай выхаваўчай работы сярод іх не праводзіць.

Крычаўскі раён.

Галя.

т. Клюйко—лепшая ўдарніца, дэлегатка Слуцкага райзьлёту калгасьнікаў-ударнікаў, прэміявана (калгас „1 мая").

Лісты работніц і калгасьніц

Ігнаруюць вылучэнак

(*Ліст работніцы*).

На папяровай фабрыцы „Спартак" шмат вылучэнак, але сярод іх ніякай работы не вядзецца, ніхто імі ня кіруе.

Есьць факты бяздушных адносін і ігнараваньня вылучэнак з боку паасобных працаўнікоў. На дрэва-масным заводзе працуе ў якасьці дэфэрборшчыцы тав.

тав. Фралова
Р-ца друкарні імя Сталіна. Падпісалася на пазыку „4-ы завяршаючы" на 175 проц. мес. заробку

Хайкіна. З работай яна спраўляецца. Часта Хайкіна працуе без падручнага, у той час, як іншыя дэфэрборшчыцы заўсёды маюць памочнікаў. Калі запытаталіся ў загадчыка цэху чаму гэта так, ён адказаў, што Хайкіну ў далейшым прыдзецца замяніць мужчынай, бо яна фізычна ня зможа працаваць у сувязі з пашырэньнем цэху. Гэта такія разважань і пасьля таго, калі тав. Хайкіна паказала на справе, што можа працаваць.

Яшчэ факт. Адну работніцу вылучылі ў якасьці райжанорга, а потым адказным сакратаром гарсавету. Але чамусьці ў апошні час яна працуе... у горацкім хлебным ларку.

Гэтым яшчэ не канчаецца. Тав. Казлова была намесьнікам дырэктара па рабочым снабжэньні. Працавала добра, але ёй не стварылі належных умоў і нарэшце яна зараз працуе на чорнай рабоце.

Усё гэта сьведчыць аб недапушчальных адносінах з боку трыкутніка фабрыкі да вылучэнак. Гэта сьведчыць аб ігнараваньні шматлікіх дырэктыў партыі пра ўвагу да вылучэнак і кіраўніцтва імі.

Шклоў.

Вольная.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя чакае адказу ад Шклоўскай РКК—РСІ, якія меры прыняты на ліквідацыі агідных адносін трыкутніка фабрыкі „Спартак" да вылучэнак.

Клюб ператварылі ў сьвіран

(*Ліст вылучэнкі калгасьніцы*)

Сьвінагадоўчы саўгас „Разульмова", Кацярынапольскага сельсавету, Касьцюковіцкага раёну, налічвае каля 60 чалавек пастаянных рабочых, якія ў большасьці працуюць на сьвіной фэрме. Усяго сьвінога пагалоўя ў саўгасе больш за тысячу. Улетку, апрача пастаянных рабочых, наймаецца сэзонная рабочая сіла. У саўгасе быў клюб, які абслугоўваў рабочых саўгасу. У клюбе праводзілася палітасьветная работа. Агульныя сходы рабочых, сходы работніц, палітгурткі, кіно, працаваў драматычны гурток і інш.

— Я зьяўлялася загадчыцай клюбу. Калі я пашла ў дэкрэтыўны водпуск 23 сьнежня, то клюб ператварылі ў сьвіран, ссыпалі туды кармы для сьвінафэрмы. Чым зусім пазбавілі магчымасьці праводзіць масавую работу сярод рабочых. Другога памяшканьня ніякага для гэтай мэты няма.

Зараз ужо мой водпуск скончыўся. Я паставіла пытаньне аб клюбе ў рабачкоме, але рабачком адмахнуўся і нічога ня вырашыў. Парт'ячэйка таксама бязьдзейнічае. Лічу такі ўчынак ліквідацыі клюбу злачынствам з боку кіраўніцтва саўгасу.

— Таксама і адносіны да мяне з боку кіраўніцтва зусім ня чулыя. — Я вылучэнка, калгасьніца, камсамолка.

Партыец Савіцкі, у якога я жыву на кватэры (кватэра саўгасная—з трох пакояў і кухні), калі нарадзілася дзіця, прапанаваў мне перайсьці ў халодную кухню. Аб гэтым ведае кіраўніцтва саўгасу і райком ЛКСМБ, але і да сёнешняга дня ў клюбе ляжаць кармы, а я бяз пэнсіі і без пайка з малым дзіцем сяджу ў халоднай кухні.

Касьцюковіч р.

Міткевіч Н.

Неадкладна ажывіць работу дэлегацкіх сходаў

У студзені гэтага году на фабрыцы „Дзьвіна" былі арганізаваны дэлегацкія сходы ва ўсіх трох зьменах.

Спачатку работа закіпела. Дэлегаткі вельмі зацікавіліся ёй. Наведваньне сходаў было 100 проц., удзельнічалі і работніцы недэлегаткі.

Гэту работу трэба было замацаваць, прымацаваць кожную дэлегатку да фабрычных арганізацый. Гэтага ня было зроблена. Жанорга тав. Баранаву накіравалі на работу ў вёску. Ня было кіраўніцтва з боку парткалектыва. Чатыры разы былі праведзены дэлегацкія сходы і на гэтым спынілася ўся работа.

Зараз дэлегацкія сходы не працуюць. Такая важная палітычная кампанія, як праверка калдагавору прайшла міма дэлегацкага сходу. З боку жансэктара гаркому КП(б)Б няма ніякага кіраўніцтва і дапамогі.

Парткалектыў павінен неадкладна ажывіць работу дэлегацкіх сходаў. Трэба прымацаваць кожную дэлегатку да фабрычных арганізацый для практычнай работы. На фабрыцы ёсьць жаночы актыў. Ёсьць усе магчымасьці для наладжаньня работы дэлегацкага сходу.

Віцебск.

Собалева.

Завочны гурток Асоавіяхіму

Тэма 2: Баявыя хэмічныя матэрыі і сродкі іх прыстасаваньня

(*Працяг*)

Хлёрацэтафэнон

Хэмічна чысты хлёрацэтафэнон зьяўляецца цьвёрдымі белымі крышталямі. Тэхнічны хлёрацэтафэнон мае бураваты, або чырвоны колер. Крышталі маюць вельмі прыемны пах—пах фіялак. Пункт кіпеньня хлёрацэтафэнону раўняецца мінус 247°, а пункт плаўленьня 58 градусаў. У момант баявога ўжываньня хлёрацэтафэнон зьяўляецца дымам. У нязначнай ступені хлёрацэтафэнон выпарваецца ў гарачыя дні. Ён у паўтары разы цяжэйшы за ваду, а пара яго ў пяць раз цяжэйшая за паветра. У вадзе хлёрацэтафэнон не рашчыняецца і не гідралізуецца. Добра рашчыняецца ў сьпірце, бэнзоле і хлёрпікрыне. На мэталі хлёрацэтафэнон ня дзейнічае і не разьядае апошніх. Ужываецца ён у снарадах, бомбах, мінах і шашках. Распазнаць яго толькі можна пры дзеяньні на вочы. Дым хлёрацэтафэнону выклікае вялікае сьлёзатачэньне і нават асьляпленьне на нядоўгі час. Пры канцэнтрацыі 0,0003 міліграма на адзін літар паветра выклікае ўжо сьлёзатачэньне.

У будучай вайне хлёрацэтафэнон будзе ўжываццa ў вялікай колькасьці, як высокатаксычная атрутная матэрыя.

Чыхальныя атрутныя матэрыі

Адамсіт

Адамсіт адносіцца да чыхальных атрутных матэрый. Чыста хэмічны адамсіт зьяўляецца цьвёрдым целам (крышталь), якое мае бледна жоўты колер. Тэхнічны адамсіт мае цёмна-зялёны колер. Пункт кіпеньня адамсіту раўняецца 410°, плавіцца пры 193°. Вялікае значэньне мае тое, што адамсіт мае ўласьцівасьць раней пункту кіпеньня ператварацца ў пару, якая цьвярдзее і дае дым. У вадзе адамсіт не рашчыняецца. Добра рашчыняецца ў ксэлёле і тулюоле. У вадзе адамсіт не гідралізуецца. Дзейнічае на жалеза, сталь і бронзу. Захоўваць адамсіт можна ў любой пасудзіне. Ужываць яго можна ў ядавіта-дымных шашках, мінах, асколачна-хэмічных бомбах. Распазнаваць яго можна па колеры дыму, які ў часе дымапуску мае жаўтаваты канарэечны колер, а таксама і па дзеяньні на органы нюху. Краі дыму адамсіту вельмі ачэрчаныя, што таксама зьяўляецца характэрным для яго ў параўнаньні з іншымі дымамі. Пры канцэнтрацыі ў 0,004 міліграма на літар паветра выклікае вельмі моцнае чыханьне, разам з гэтым і кашаль. Чыханьне цягнецца значны час, нават пасьля выхаду з заражанай зоны. Вялікія канцэнтрацыі выклікаюць паражэньне лёгкіх і дыхальных ходаў. Дзякуючы лёгкасьці і таннасьці атрыманьня, а таксама і вялікай таксычнасьці, адамсіт у будучай вайне зойме вельмі вялікае месца сярод іншых атрутных матэрый. Ахова ад дыму адамсіту—вугольны супроцьгаз.

Дыфэніл-хлёрарсін

Тэхнічны прадукт дыфэніл-хлёрарсін—бурая цьвёрдая маса, якая мае белы колер. Пункт кіпеньня—333°, а пункт плаўленьня—44—45°. Пры захаваньні дыфэнілхлёрарсін цьвёрдая матэрыя, пры ўжываньні—дым. Удзельная вага яго—1,5. У вадзе дыфэніл хлёрарсін рашчыняецца вельмі дрэнна. На літар рашчыняецца ўсяго два грамы дыфэніл-хлёрарсіну, лепш рашчыняецца ў сьпірце, нафце і бэнзыне. З атрутных матэрый добра рашчыняецца ў фасгене. У вадзе амаль што зусім не гідралізуецца. Добра гідралізуецца ў сьпіртавой шчолачы. На мэталі, як сьвінец і жалеза, ня дзейнічае. Заўважана, што ў пасудзінах, дзе ёсьць швы, уплывае на апошнія, разбураючы іх. Ужываецца ў шашках, асколачных мінах, снарадах. Распазнаць дыфэніл-хлёрарсін можна толькі пры дзейнасьці на арганізм чалавека. Пры канцэнтрацыі 0,001 міліграма на адзін літар паветра выклікае вялікае раздражненьне ў горле і носе. Ахова ад яго—вугольны супроцьгаз.

Нарыўныя атрутныя матэрыі

Іпрыт

Іпрыт складаецца з некалькіх атрутных матэрый. У склад іпрыту як аснова ўваходзіць дыхлёрэцігсульфід. Іпрыт быў ужыт у першы раз 22 ліпеня 1915 году немцамі ў артылерыйскіх снарадах супроць ангельцаў на рэчцы Іпры, адкуль і атрымаў назву іпрыту.

Хэмічна-чысты іпрыт зьяўляецца густаватым маслам, які ня мае колеру. Пункт кіпеньня іпрыту раўняецца 217°, цьвярдзее пры 13°. Пры заражэньні мясцовасьцяй ужываецца тэхнічны іпрыт, які ў сваім складзе, як мешаніну, мае серку. Тэхнічны іпрыт таксама зьяўляецца вадкасьцю, якая мае цёмны колер. Іпрыт мае пах тухлай гарчыцы, таму яшчэ апрача назвы іпрыту ён мае назву гарчычнага газу. Вышэй адзначаны пункт плаўленьня іпрыту не дае магчымасьці ўжываць яго пры вялікім марозе зімой, бо ў гэты момант пры нізкай тэмпэратуры ён будзе цьвёрдай матэрыяй. Таму для зьніжэньня пункту плаўленьня да іпрыту дадаюцца розныя матэрыі. Дзякуючы мешаніне, зацьвярдзеньне іпрыту можа быць даведзена да 12 градусаў. Такое панібыць даведзена да 12 градусаў. Такое панібыць даведзена да 12 градусаў. Такое панібы

1961 г.

на розныя матар'ялы. Сам іпрыт у сабе добра рашчыняе гуму, таму ён праз некаторы час лёгка прасякае праз яе і паражае скуру. На мэталі іпрыт ня дзейнічае за выключэньнем латуні і волава. Гэта дае магчымасьць наліваць яго у знарады, бомбы бяз усякай пракладкі.

Іпрыт добра ўбіраецца рознымі порыстымі матэрыямі, апрача гэтага мае магчымасьць хутка прасякаць праз вопратку і абутак. Праз шкло і мэталі іпрыт амаль што не прасякае.

Хаваецца іпрыт ужалезных бочках. Як шкодныя мешаніны, у ім не павінны быць саляная кіслата і жалеза.

Дзейнічаць іпрыт на арганізм чалавека можа і ў вадкім стане, а таксама ў стане пары ці туману. Пасьля пападаньня на скуру адразу ён не дае ніякіх прымет, а толькі праз гадзін 4—8 разьвіваецца паражэньне скуры. Спачатку зьяўляецца пачырваненьне вучастку скуры, на які папаў іпрыт, потым робіцца пухір пасьля якога зьяўляецца балячка.

Пры пападаньні у лёгкія іпрыту ў стане туману ці пары праз 6—8 гадзін зьяўляецца катар, хрыпласьць, сухі гарлавы кашаль. З носу пачынаюць выдзяляцца вадзяністыя, а потым гнойныя выдзяленьні.

Пры пападаньні іпрыту ў вочы праз 4—6 гадзін зьяўляецца рэзь у вачох, а потым сьлёзатачэньне, якое пераходзіць у сьветабоязьнь. У далейшым у залежнасьці ад паражэньня зьяўляецца пачырваненьне павекаў, іх прыпуханьне, выдзяленьне гною з вачэй.

Пры пападаньні іпрыту разам з вадою ці стравою ў страўнік апошні таксама паражаецца. Пры паражэньні страўніка ў чалавека пачынаецца вантаваньне, рэзкая зьнямога арганізму, якая ў большасьці прыводзіць да сьмерці, нават пры невялікай колькасьці пападаньня іпрыгу ў страўнік.

Трэба памятаць, што пры вялікай канцэнтрацыі іпрыту вельмі хутка можа наступаць сьмерць пры паражэньні ў пэрыяд першых дзён.

Пры баявым ужываньні іпрытам начыняюцца артылерыйскія знарады, авіябомбы і міны. Апрача гэтых мэтадаў заражэньня мясцовасьцяй, заражэньне можа праводзіцца з баявых хімічных машын або самалётаў. Пры заражэньні мясцовасьці іпрыт можа знаходзіцца вельмі значны час (ад тыдню да некалькіх месяцаў) ня трацячы сваёй таксычнай уласьцівасьці. Баявыя канцэнтрацыі іпрыту—0,05 міліграма на адзін кубічны мэтр—выклікаюць запаленьне вачэй, а пры канцэнтрацыі 0,1 міліграма на адзін кубічны мэтр пры ўдыханьні на працягу 15 хвілін выклікае адразу сьмерць. Для заражэньня мясцовасьці на адзін квадратовы мэтр даецца ад 25 да 50 грам іпрыту.

Для дэгазацыі іпрыту ўжываецца хлёрная вапна. Гэты белы парашок, які мае пах хлёру.

Хлёр з вапны паступова выпарваецца. Таму вапна мае сваю вартасьць толькі тады, калі яшчэ ня выпарыўся хлёр. На адкрытым паветры хлёрная вапна хутка ўбірае вільгаць і страчвае сваю дэгазацыйную ўласьцівасьць. Таму хлёрную вапну трэба хаваць у шчыльных драўляных бочках.

Пры пасыпаньні хлёрыстай вапнай заражанага іпрытам вучастку яна пры злучэньні з ім дае вялікую колькасьць цяплыні, якая разлагае іпрыт, у выніку чаго ён губляе сваю таксычнасьць. Для аховы людзей ад іпрыту цяпер існуе спэцыяльная вопратка.

А. Маркавец

Жанчына авіатэхнік 2-й аб'яднанай школы пілотаў

ЗДАВАЙЦЕ

ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ на 1933 г.

ЛІСТАНОСЦАМ
АБО
НА ПОШТУ

ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
6 РАЗОЎ
У МЕСЯЦ

КАШТУЕ 30 КАП.
У МЕСЯЦ

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63,

Выданьне ЦК КП(б)Б. Адк. рэдактар Э. ШАПІРА.

Друкарня імя Сталіна Заказ № 927 У ліку 11.070 экз. Менгарліт № 1416.

ыняюцца
. Апра-
ьцяй, за-
хімічных
цовасьці
час (ад
ваёй так-
энтрацыі
мэтр—
энтрацыі
ры ўды-
адразу
на адзін
іпрыту.
хлёрная
хлёру.
а. Таму
алі яшчэ
хлёрная
ваю дэ-
о вапну
чках.
заража-
ьні з ім
разлагае
чнасьць.
нуе спэ-

ркавец

ПІРА.

1416.

##3Н// 193437 (050)

1964 г.

#ЗН#193437(050)

B0000000 193 1 166